

# Аб'ект даследавання — шматкроп'е

***Асновай графічнай сістэмы любой мовы з'яўляюцца літары і знакі прыпынку. А.П.Чэхаў пісаў: «Знакі прыпынку — гэта як ноты пры чытанні». Мы звыкла выкарыстоўваем іх падчас пісьма. Бачым пры рабоце з друкаванымі крыніцамі. І не заўсёды задумваемся: якую ролю выконвае той ці іншы знак? Чаму аўтар выкарыстоўвае менавіта такі знак прыпынку?***

Асаблівасцю сённяшняга часу з'яўляецца выкарыстанне знакаў прыпынку ў выпадках, якія не адпавядаюць пунктуацыйным нормам. У сетцы інтэрнэт карыстальнікі могуць увогуле абыходзіцца без знакаў прыпынку або надаваць ім толькі сімвалічнае значэнне. Там жа мы напаткалі верш з адзіным знакам прыпынку ў канцы сказаў. Гэты знак — шматкроп'е. Стала цікава: чаму такая ўвага да гэтага знака? Якую ролю выконвае шматкроп'е ў паэзіі? Так і ўзнікла задума заняцца вывучэннем выкарыстання шматкроп'я ў паэтычных творах, якая перарасла ў даследаванне "Функцыянальная значнасць шматкроп'я ў сучаснай паэзіі", якое пад маім кіраўніцтвам праводзіла вучаніца 11 класа нашай установы адукацыі.




Матэрыялам для даследавання выбралі вершы сучаснага беларускага паэта Міхася Башлакова. Чаму менавіта Міхась Башлакоў? Вершы з кнігі лірыкі "Віно адзінокіх", выдадзенай да 60-годдзя паэта (якія і сталі матэрыялам даследавання), кранулі пранікнёным лірызмам, эмацыянальнасцю, шчырасцю. Паэзія Міхася Башлакова прапанавана для вывучэння ў 11 класе, таму матэрыял даследавання мае практычную скіраванасць. Пры ўважлівым прачытанні вершаў звярнулі ўвагу на частотнае выкарыстанне пунктуацыйнага знака шматкроп'е: у прааналізаваных 233 вершах паэта шматкроп'е выкарыстоўваецца ў саміх тэкстах (пачатку, канцы, сярэдзіне сказаў) у 229 вершах. У 4 вершах шматкроп'ем заканчваецца загаловак. Вынікі даследавання аказаліся настолькі цікавымі, што захацелася імі падзяліцца.

Пачалі работу з вывучэння гісторыі ўзнікнення знака. Аказалася, што яго выкарыстоўвалі яшчэ ў Старажытнай Грэцыі. Рымскі аратар Квінтыліян у сваіх працах заклікаў выкарыстоўваць шматкроп'е толькі ў тых выпадках, калі "ўсё і так зразумела". З'яўленне ў 1831 годзе шматкроп'я ў граматыцы як пунктуацыйнага знака звязана з імем расійскага лінгвіста А.Х.Вастокава. Толькі назва шматкроп'я была "знак спыняльны". У прастамоўі яшчэ называлі трохкроп'ем. Карусь Каганец у кнізе "Беларускі лемэнтар, або першая навука чытання" (1906) даў шматкроп'ю назву недаказ. У "Беларускай граматыцы для школ" (1918) Б.А.Тарашкевіч ужо выкарыстоўвае двайную назву знака: недаказ або мнагакроп'е. Толькі ў 1937 годзе ў "Руска-беларускім слоўніку" АН БССР канчаткова замацавалася назва шматкроп'е.

Цікава, што гэты пунктуацыйны знак выкарыстоўваецца ў розных мовах, але правілы яго ўжывання своеасаблівыя. У беларускай мове шматкроп'е складаецца з трох кропак. У англійскай мове яно можа складацца як з трох, так і з чатырох кропак. У кітайскай мове шматкроп'е — гэта шэсць кропак: дзве групы па тры кропкі.

Традыцыйна ў мовазнаўстве шматкроп'ю надавалася раздзяляльная функцыя. У прааналізаваных вершах мы адшукалі прыклады выкарыстання знака ў сказах, незавершаных граматычна або па сэнсе, у канцы назыўных сказаў, у сказах з аднароднымі кампанентамі пры незавершаным пералічэнні. Разам з тым адзначылі, што ў сучаснай паэзіі раздзяляльная функцыя шматкроп'я рэалізуецца паралельна з функцыяй замяшчэння, калі шматкроп'е ставіцца, напрыклад, пасля звароткаў, у канцы сказаў з клічнай інтанацыяй.

Але мы заўважылі, што ў сучаснай літаратуры на першы план выходзяць функцыі шматкроп'я, якія раней былі рэдкімі. У асноўнай частцы работы намі вызначаны і даказаны яшчэ дзве функцыі шматкроп'я: сэнсавая і экспрэсіўная. Гэты знак можа перадаваць цэлы спектр сэнсаў, якія стаяць за нежаданнем надаваць думцы слоўны выгляд. І гэтая яго функцыя пераводзіць знак у катэгорыю сімвала, кода. Намі адзначаны выпадкі, калі шматкроп'е ў вершах Міхася Башлакова выступае сімвалам маўчання, метафізічнай паўзы, магчымасці працягу, часу, не запоўненага дзеяннем, глыбокага філасофскага вываду, цішыні, кантрасту, глыбокага роздуму.

Пашырана ў паэзіі Міхася Башлакова выкарыстанне шматкроп'я як паказчыка пераходу да іншай думкі; ад знешніх апісанняў да ўнутранага стану; да нечаканага вываду; ад апісання да высновы; ад разважанняў да высновы; ад няўласна-простай мовы да аўтарскай і наадварот; ад чаканага факта да нечаканага выніку; ад знешняга маўлення да ўнутранай рэфлексіі.

Сярод вершаў Міхася Башлакова знайшлі тры творы, у якіх шматкроп'е з'яўляецца адзіным (або практычна адзіным) знакам прыпынку ў канцы сказаў. Гэта вершы "Лісток зжаўцелы...", "Сон-трава", "Не захінайце неба зайздрасцю". Увогуле, вершы з такой пунктуацыяй можна лічыць індывідуальнай аўтарскай задумай. А шматкроп'е — спосаб рэалізацыі задумы і ўзмацнення сэнсавай змястоўнасці. У многіх вершах паэта шматкроп'е — гэта аўтарскае ўяўленне аб тым, як павінен гучаць твор пры дэкламацыі. Гэта сімвал, адкрыты для інтэрпрэтацыі, які ўключае чытача ў дыялог-разважанне.

Падчас аналізу вершаў Міхася Башлакова адзначылі, што шматкроп'е ў яго паэзіі з'яўляецца знакам, які перадае шырокі спектр эмоцый, псіхалагічны настрой аўтара. Яно мае экспрэсіўную функцыю, можа быць замяшчальнікам слоў, не сказаных з розных прычын. Магчыма, з прычыны асаблівага хвалявання, калі адзіна правільныя словы не падпарадкоўваюцца волі аўтара, або таму, што любое слова становіцца заведама лішнім з прычыны відавочнасці таго, што адбываецца. Важны элемент экспрэсіўнасці знака — перадача ім лагічнага націску. З дапамогай шматкроп'я аўтар або засяроджвае ўвагу на самым важным, або знімае катэгарычнасць выказвання.

Сярод прааналізаваных вершаў Міхася Башлакова 210 заканчваюцца шматкроп'ем (90%). У большасці выпадкаў шматкроп'е ў такой пазіцыі падкрэслівае пачуцці, якія зведвае аўтар, разважаючы над сказаным. У такіх сказах няма абрыву думкі, яны па сваёй структуры завершаныя. Але сэнс сказанага набывае экспрэсіўную афарбоўку. Гама пачуццяў разнастайная. Шматкроп'е ў такіх вершах імпліцыруе як станоўчыя, так і адмоўныя эмоцыі: замілаванасць, аптымізм, захапленне, горыч, безнадзейнасць, пераасэнсаванне каштоўнасцей і інш.

У ходзе работы зрабілі выснову, што шырокае выкарыстанне шматкроп'я ў вершах можна лічыць асаблівасцю ідыястылю Міхася Башлакова. Увогуле, можна смела сцвярджаць, што ў сучаснай паэзіі назіраецца пашырэнне сферы выкарыстання шматкроп'я з самымі рознымі мэтамі. А значыць, шматкроп'е — пунктуацыйны знак з шырокім сэнсавым напаўненнем, здольны перадаваць багатую гаму пачуццяў.

Матэрыялы па выніках даследавання аформлены ў выглядзе памяткі "Цікавае пра пунктуацыйны знак", якая змешчана на стэндах у кабінетах беларускай мовы і літаратуры. Для членаў аб'яднання па інтарэсах "Чароўнае слова", якія спрабуюць свае сілы ў напісанні вершаў, выдадзена брашура. Спадзяёмся, што ўсе, хто азнаёміцца з вынікамі нашай работы, будуць больш пільна прыглядацца да шматкроп'я ў вершах як да знака з вялікімі магчымасцямі, спрабаваць разгадаць яго функцыі.

**Ганна ТРАФІМОВІЧ,**
**настаўніца беларускай мовы і літаратуры**
**сярэдняй школы № 5 Мастоў.**